# ЗАЎТРА — V УСЕБЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ СХОД


Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

21 ЧЭРВЕНЯ 2016 г. АЎТОРАК № 116 (28226) Кошт 2100 рублёў

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А


**ЗАДАВАЙЦЕ ПЫТАННІ, ВЫКАЗВАЙЦЕ ПАЖАДАННІ**

**Падчас правядзення пятага Усебеларускага народнага сходу будзе працаваць «гарачая» тэлефонная лінія. 22 чэрвеня 2016 года — з 11.00 да 18.00 і 23 чэрвеня 2016 года — з 10.00 да 13.00.**

**Кожны ахвотны можа патэлефанаваць па шматканальных тэлефонах: 276-00-00, 282-00-00, задаць пытанні, выказаць пажаданні. Код Мінска — 8-017.**

## Краіна хараства

Фота БЕЛТА.

Удзельніцы конкурсу «Міс-Беларусь» у старажытных строях. СТАР. 7

## ЦЫТАТА ДНЯ

**Ігар БУЗОЎСКІ, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«Узаемадзеянне эканомікі і ідэалогіі павінна выходзіць на новы ўзровень. Сёння такі пасыл, як сацыяльна арыентаваная дзяржава, пераасэнсоўваецца. Гэта не эгаістычнае стаўленне да дзяржавы. Гэта ўсведамленне таго, што неабходна напружвацца, рабіць намаганні як прафесіяналу, як чалавеку, які развіваецца духоўна, маральна, творча, для таго, каб атрымаць у нашым агульным саюзе пад назвай Рэспубліка Беларусь часцінку перамог».*

## Месцы сілы Ядвігіна Ш. і Янкі Купалы

СТАР. 8–9

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 21.06.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 19727,00 | ▼ |
| Еўра | 22368,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 307,68 | ▲ |
| Укр. грыўня | 793,37 | ▼ |


ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 16116


■ Водбліскі

## ДЛЯ СУСВЕТУ 75 — МАЛА...

Заўтра Брэсцкая крэпасць прачнецца на досвітку. Няважна, чыстае будзе неба або зацягнутае хмарамі — яно на колькі хвілін ператворыцца у адчайна-насцярожанае ад гулу самалётаў і сірэн. Небу не патлумачыш, што гэта ўсяго толькі пастановачныя гукі, яны нагадваюць мірным людзям, які гэта жах — вайна, што прыйшла на нашу зямлю 75 гадоў назад. Бо для яго, для Сусвету, гэта занадта малы адрэзак часу, каб забыцца. Бо яшчэ недзе за тысячы светлавых гадоў у яго бяскрайніх абсягах не сціхлі стогны і галашэнні соцень тысяч зямлян, якіх забіла і зрабіла сіротамі тая вайна.

Людзі забываюць хутчэй. Тыя, каму ўсё роўна. Тыя, у каго ў сям'і няма забітых і асірацелых. Гэта не пра нас. 75 гадоў — усяго толькі два пакаленні. Дастаткова, каб сцішыць боль, але зусім мала, каб пазбавіцца памяці.

СТАР. 4–5

■ Прыватызацыя жылля

## ДА АПОШНЯГА КЛІЕНТА

Да завяршэння прыняцця дакументаў на прыватызацыю жылых памяшканняў засталіся лічаныя дні

**1 ліпеня заканчваецца тэрмін прыёму заяў на прыватызацыю жылля. А вось пасля гэтай даты ўсе непрыватызаваныя кватэры будуць пераведзены ў разрад жылых памяшканняў камерцыйнага выкарыстання. Колькі падобнага жылля застаецца ў нашай краіне і што з ім будзе надалей? На гэтыя і іншыя пытанні адказваюць спецыялісты Мінжылкамгаса, Дзяржкаммаёмасці і сталічнай мэрыі.**

СТАР. 3


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

**ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА**

**5 разоў на тыдзень!**

**Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2016 года!**

**Падпісацца на газету можна самымі рознымі спосабамі (нават не выходзячы з дома). Падрабязней пра гэта, а таксама кошт, падпісныя індэксы — на нашым партале zviazda.by.**

**ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!**

# БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

**Апошняя субота перад V Усебеларускім народным сходам для ўладнай вертыкалі краіны была не проста працоўнай: яна прайшла ў фармаце прамога кантакту з тымі, для каго ўлада працуе — з простымі людзьмі. Сем «прамых ліній» з кіраўнікамі рэгіёнаў і сталіцы, сотні званкоў, дзясяткі размоў без пасярэднікаў, і па кожнай — канкрэтныя даручэнні, за кожнай — тое, што хвалюе людзей, а значыць, не павінна пакідаць абыякавым і чыноўнікаў. Пра што людзі прасілі, паведамлялі і што прапаноўвалі — у матэрыялах нашых карэспандэнтаў.**

## КВАТЭРНАЕ ПЫТАННЕ — САМАЕ АКТУАЛЬНАЕ

**Нягледзячы на лета, суботу, водпускі і лецішчы, многія мінчане не захацелі прапусціць магчымасць асабіста пагутарыць з мэрам свайго горада. На «прамую лінію» да старшыні Мінгарвыканкама за тры гадзіны было зафіксавана каля 3000 спроб дазвону. Змаглі датэлефанавацца 58 чалавек, з 19 з іх пагутарыў асабіста старшыня Мінгарвыканкама Андрэй ШОРАЦ, 39 былі перанакіраваныя ў раённыя адміністрацыі.**

Адзін з тых, хто дазваніўся на «прамую лінію», Валерый Антонавіч, расказаў, што яго сям'я з 9 чалавек жыла ў прыватным доме ў Грушаўцы. У 1984 годзе ім далі тры кватэры. Цяпер мінчанін спрабуе даказаць, што ім паложана бязвыплатная прыватызацыя. «Разбярыцеся з гэтым, калі ласка», — папрасіў ён мэра... Былі і іншыя званкі, звязаныя з праблемамі прыватызацыі. Тэма гэтая востра стаіць для часткі нашых суграмадзян, якія хочуць паспець прыватызаваць сваё жыллё.

Але мінчане на «прамой лініі» расказвалі не толькі пра свае асабістыя праблемы — неабыякавыя жыхары сталіцы хацелі палепшыць жыццё ў горадзе ў цэлым. У сваіх званках яны закранулі пытанні гандлёвага абслугоўвання і несанкцыянаванага гандлю, працы грамадскага транспарту, добраўпарадкавання сталічных зон адпачынку, праблемы, звязаныя з паркоўкай аўтамабіляў у дварах і многія іншыя. Усе звароты былі ўзятыя на кантроль.

Разам з тым, як паведаміў Андрэй Шорац, усё больш праблемных пытанняў вырашаецца раённымі адміністрацыямі горада. «Узімку мінулага года колькасць тых, хто званіў на «прамую лінію», была ў разы большай, першыя месяцы рэгістравалася каля 27 тысяч спробаў дазвону. Розніца відавочная. Усё гэта сведчыць, у тым ліку, аб памяншэнні колькасці праблемных пытанняў», — сказаў старшыня Мінгарвыканкама. І дадаў, што раней часцей гучалі тэмы ЖКГ, добраўпарадкавання. Цяпер жа большасць такіх пытанняў вырашаецца на ўзроўні службы 115.бел, якая пачала працаваць у Мінску ў лістападзе мінулага года.

**Святлана БУСЬКО.**
*busko@zviazda.by*

## АЎТОБУСНЫ ПРЫПЫНАК УЛАДКУЮЦЬ

**На «прамую лінію» да старшыні Брэсцкага аблвыканкама Анатоля ЛІСА дазваніліся 29 жыхароў вобласці. Пытанняў было нашмат больш, бо асобныя грамадзяне агучвалі адразу некалькі праблем. На некаторыя пытанні губернатар адказваў адразу, іншыя былі аформлены ў даручэнні службовым асобам, бо патрабуюць дадатковага вывучэння.**

Званок з вёскі Роўбіцк Пружанскага раёна датычыў транспартнага абслугоўвання. Побач з указаным населеным пунктам праходзіць новая аб'язная дарога вакол Белавежскай пушчы. Па дарозе зараз курсіруе аўтобус Гродна — Брэст, чаму жыхары вёскі вельмі рады. Ёсць прыпыначны пункт, на якім аўтобус спыняецца. Ды гэтае месца абазначана толькі знакам: ні павільёна, ні лавачкі для пасажыраў няма. Магчыма, пры праектаванні дарогі пункт пазначылі як прыпынак па запатрабаванні. Але цяпер трэба пайсці насустрач жыхарам вялікай вёскі, адзначыў губернатар, і даручыў дарожнікам вырашыць пытанне з установкай хаця б невялікага павільёна. Людзі не павінны ў дождж ці снег чакаць аўтобус у чыстым полі.

Прадпрымальнік з Брэста, які аказвае паслугі па перавозцы пасажыраў, узняў пытанне стварэння роўных умоў для розных фірмаў, якія працуюць у гэтай галіне.

Нечакана для кіраўніка вобласці і для многіх прысутных на «прамую лінію» паступіла аж два звароты пра адстрэл бадзяжных жывёл у населеных пунктах сярод белага дня. На гэты конт службовыя асобы атрымалі строгае ўказанне разабрацца аператыўна. Ніхто не мае права прымяняць агнястрэльную зброю ў гарадах і вёсках для знішчэння жывёл.

З вёскі Струга Столінскага раёна патэлефанавала Алена Белавус. Ад імя гаспадароў прысядзібных сотак жанчына прасіла не закрываць іх ветэрынарны ўчастак. Старшыня аблвыканкама адразу абнадзеіў гаспадыню, што ў іх вёсцы абавязкова застанецца адна штатная адзінка хай сабе і раённай ветстанцыі.

І калі прыведзеныя вышэй прыклады зваротаў датычыліся калектыўнага інтарэсу, то былі і асабістыя просьбы. Але пытанні, якія ўзнімалі людзі, надзвычай важныя для іх. Так, жыхарка Брэста расказала пра сваю сястру, інваліда другой групы, якая тры разы на тыдзень мусіць праходзіць працэдуру гемадыялізу. Апошні год жанчына не ходзіць, бо атрымала пераломы. Інвалідная каляска ў звычайны аўтамабіль не змяшчаецца. І яны карыстаюцца сацыяльным таксі. Але ў горадзе ёсць толькі адна машына такога прызначэння, і тая часта ламаецца. Да таго ж кошт паслугі для інвалідаў значны, за тыдзень даводзіцца плаціць па 240 тысяч рублёў, і кожны дзень перажываць, каб заўтра машына прыйшла, а не стала на рамонт.

Кіраўнік вобласці даў даручэнне ўпраўленню аховы здароўя пераабсталяваць адну з машын хуткай дапамогі альбо набыць новую для перавозкі падобных пацыентаў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

## ЯК БЕЗ ЛІФТА НА 9-ты ПАВЕРХ?

**«Трэба ўявіць сябе на месцы людзей, якія абгрунтавана звяртаюцца да ўлады па дапамогу», — з такім заклікам да адказных асоб звярнуўся губернатар Віцебшчыны падчас «прамой лініі». Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай ШАРСТНЁЎ за больш чым тры гадзіны выслухаў прыблізна 25 чалавек.**

Аднаму, дарэчы, праз тэхнічныя праблемы (размова па тэлефоне «зрывалася») удалося выйсці на сувязь 3 разы. Настойлівы пенсіянер, які жыве ў прыгарадзе Віцебска, абураўся, чаму ў дзяржаўнай паліклініцы трэба плаціць за стаматалагічныя паслугі. Тым больш што памер пенсіі невялікі. Губернатар даручыў разабрацца.

Па традыцыі вельмі шмат званкоў было па тэме ЖКГ. Мужчына скардзіўся на слабы напор вады ў шматпавярховым доме. Паступіў сігнал пра тое, што ў 9-павярховым доме яшчэ ў сакавіку адключылі ліфт, які абяцалі запусціць да 9 мая, але абяцанне не выканана дагэтуль. Жыхар глыбінкі прасіў разабрацца, ці правільна падлічаны кошт паслуг за пракладку газавай трубы да яго дома, з улікам таго, што ён сам выкапаў траншэю і выканаў іншыя падрыхтоўчыя работы. З Оршы пазваніў ахоўнік арганізацыі, якая займаецца вывазам смецця, і паведаміў, што яго начальнік патрабаваў пяць бутэлек каньяку і намякнуў на іншую «матэрыяльную ўдзячнасць» за магчымы працяг працоўных адносін... Скардзіліся і на несвоечасовыя выплаты: за здадзенае малако, заробкі і па лісце часовай непрацаздольнасці.

Аналізуючы апошнія «прамыя лініі», Мікалай Шарстнёў падкрэсліў, што выканкамам трэба працаваць на апярэджанне зваротаў. Калі будуць своечасова выяўляць праблемы, вырашаць іх, званкоў ад людзей стане менш.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

## ПАЎТОРНЫХ ЗВАРОТАЎ НЕ БЫЛО

**Адсутнасць паўторных зваротаў на «прамую лінію» сведчыць пра няўхільнае выкананне абяцанняў, адзначыў падчас прамой тэлефоннай лініі ў мінулую суботу старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір ДВОРНІК. Дарэчы, назіраецца тэндэнцыя зніжэння і агульнай колькасці званкоў. Кардынальна змянілася тэматыка праблем, якія ўзнімаюцца людзьмі:**

— Людзі ўжо не звяртаюцца з пытаннямі, да рашэння якіх часам было нават складана падступіцца. Сур'ёзных праблем не прагучала, а бывае нават, што чалавек проста хоча выказаць сваю думку. Мне кожны раз цікава не толькі паслухаць людзей, але і адчуць, што хвалюе вобласць у цэлым, кожны раён паасобку.

Усяго на прамую тэлефонную лінію ў Гомельскі аблвыканкам паступіла 88 зваротаў. Да сур'ёзных праблем зараз можна аднесці якасць дарог у сельскіх населеных пунктах. Шматлікія звароты грамадзян на гэтую тэму далі штуршок да прыняцця ў вобласці кардынальнага рашэння. Сельскія дарогі з камунальнай гаспадаркі перададзены на баланс дарожных службаў. Сітуацыя паступова стала выпраўляцца.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*

## ЖКГ, ЖЫЛЛЁ, РАБОТА...

**Перад пачаткам суботняй прамой тэлефоннай лініі з жыхарамі вобласці старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ абмяркоўваў з адпаведнымі службовымі асобамі сітуацыю, што склалася ў выніку прыроднага катаклізму.**

У пятніцу навальніца з моцным ветрам «разгулялася» ў дзевяці раёнах Гродзеншчыны. Згодна з інфармацыяй абласнога ўпраўлення МНС, былі пашкоджаны дахі 44 жылых дамоў, 36 сельскагаспадарчых і 9 адміністрацыйных будынкаў, трансфарматарнай падстанцыі, абясточана 170 населеных пунктаў. Зарэгістравана 126 паведамленняў аб падзенні дрэў на праезныя часткі, жылыя дамы і лініі электрапередач, у абласным цэнтры яны пашкодзілі 14 легкавых аўтамабіляў. З-за галін, што ўпалі на чыгуначныя пуці, адбылася затрымка руху чатырох цягнікоў на станцыі Гродна. З пераломам галёнкі ў бальніцу даставілі жанчыну, якая пацерпела ад падзення ліста шыферу.

Уладзіміру Краўцову патэлефанаваў на «прамую лінію» мужчына з садоўніцкага таварыства Чэхаўшчызна ў Гродзенскім раёне. Ён прыехаў з унукамі на дачу, а дом абясточаны.

Усяго на гэтую «прамую лінію» паступіла 112 званкоў. Як правіла, людзі адразу ж атрымлівалі тлумачэнні ад спецыялістаў тых ці іншых службаў, праверку шэрагу зваротаў узялі на кантроль. А ў некаторых выпадках спатрэбіліся даручэнні старшыні аблвыканкама. У прыватнасці, па сітуацыі на вуліцы Альшымаўскай у Ваўкавыску, дзе няма вады: трубаправод летась праклалі, але работы па яго падводзе да прыватных дамоў прыпынены. Да таго ж не завяршылі добраўпарадкаванне тэрыторыі, і ў дрэннае надвор'е яна становіцца цяжкапраходнай.

Дарэчы, на «прамую лінію» ў аблвыканкам цяпер тэлефануюць значна менш, чым напачатку ўводу ў практыку гэтай формы дыялогу ўлады з насельніцтвам.

Што тычыцца характару зваротаў, то ён фактычна не мяняецца — гэта ўжо традыцыйна пытанні, звязаныя з жыллёва-камунальнай гаспадаркай: утрыманне, капітальны рамонт жылля, забяспечанасць вадой, цяплом, газам...

— Узнікаюць і новыя пытанні, у прыватнасці па жыллёвым будаўніцтве, — зазначыў Уладзімір Краўцоў. — У мінулыя гады існавалі праграмы з вялікімі аб'ёмамі сродкаў дзяржаўнай падтрымкі для пэўных катэгорый грамадзян. Сёння такія сродкі абмежаваны, і ўзнікае шмат пытанняў.

Пільнай увагі ўлады патрабуе і сітуацыя на рынку працы.

— У эканоміцы цяпер адбываюцца даволі складаныя працэсы, у шэрагу рэгіёнаў ёсць напружанасць на рынку працы. Нямала людзей сёння шукаюць работу і, зразумела, звяртаюцца ў тым ліку і на «прамую лінію» ў аблвыканкам. Таму наша першачарговая задача — ствараць новыя прадпрыемствы, вытворчасці, рабочыя месцы, каб людзі мелі магчымасць працаваць, — лічыць Уладзімір Краўцоў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
*prakopchik@zviazda.by*

## ВЫСЛУХАЦЬ, ПАРАІЦЬ, ДАПАМАГЧЫ

**Чарговую прамую тэлефонную лінію правёў 18 чэрвеня старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Іван ЛІПНІЦКІ. Спектр пытанняў, з якімі звярталіся грамадзяне, вельмі шырокі і разнастайны — ад прыватызацыі жылля да рамонту дамоў, уладкавання дарог і цэнтралізаванага водазабеспячэння.**

Сустракаліся і праблемы, якія сапраўды вартыя ўмяшання зверху. У прыватнасці, Анатоль Сцяпанавіч расказаў, што яго старэнькая маці жыве ў вёсцы Навасёлле Мінскага раёна. З сакавіка ў яе доме працягваецца рамонт, камунальнікі цалкам разабралі дах. І не робяць нічога, каб закончыць работы. Падчас дажджу вада залівае кватэру, маёмасць, мэблю жыхароў. Акрамя таго, будаўнікі не прыбіраюць за сабой смецце.

— Літаральна з сённяшняга дня абяцаю падняць тэму з тым, каб у вас завяршылі рамонт даху і навялі навокал парадак, — супакоіў заяўніка Іван Эдуардавіч.

Наталля Віктараўна з Салігорска паскардзілася, што ў яе доме па вуліцы Кастрычніцкай паверхам вышэй кватэру аддалі пад інтэрнат. Тут часта мяняюцца жыхары, вядуць яны сябе надта шумна. Могуць нават сярод ночы ўключыць пральную машыну. Словам, сям'я страціла спакой і сон. Жанчына звярталася ў райвыканкам, міліцыю. Яе разумеюць, але пытанне так і не вырашаецца.

Іван Ліпніцкі запэўніў, што накіруе просьбу ў пісьмовым выглядзе асабіста старшыні райвыканкама, каб той дапамог навесці парадак.

За тры гадзіны Іван Эдуардавіч выслухаў 52 жыхароў цэнтральнага рэгіёна. Па 24 зваротах былі дадзены неабходныя тлумачэнні і кансультацыі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

## ПАДЗЯЛІЛІСЯ НАБАЛЕЛЫМ

**Кожны другі, хто звярнуўся на суботнюю «прамую лінію» ў Магілёўскі аблвыканкам, быў пенсіянер. Жыхары Магілёўшчыны былі заклапочаны пытаннямі прыватызацыі, медыцынскага абслугоўвання, курортна-санаторнага аздараўлення, росту цэн, выплаты заробкаў... Весці «прыём» старшыні Магілёўскага аблвыканкама Уладзіміру ДАМАНЕЎСКАМУ дапамагалі спецыялісты структурных падраздзяленняў аблвыканкама. Са старшынямі райвыканкамаў была арганізавана відэасувязь.**

Жыхарка Краснапольскага раёна папрасіла дапамогі ў працаўладкаванні. На выхаванні жанчыны непаўналетняе дзіця, а знайсці працу па яе спецыяльнасці (бібліятэкар) у раёне няма магчымасці. Яна згодна змяніць прафесію, але з вакансіямі складана.

Жыхарка вёскі Камінтэрн Магілёўскага раёна звярнулася з просьбай спрасціць выдачу даведак для насельніцтва, якое лішкі вырашчанай на сваім прысядзібным участку сельгаспрадукцыі прадае на рынку.

Уладзімір Аляксандравіч з Магілёва выступіў з прапановай прыдаць статус «дзеці вайны» ўсім тым, хто ў малалетнім узросце аказаўся на акупаванай тэрыторыі.

Некалькі пытанняў датычыліся выплаты заробкаў. Губернатар паабяцаў разабрацца па кожным канкрэтным выпадку. А таксама нагадаў адпаведным службам пракантраляваць выплату заробкаў да 21 чэрвеня.

Дапамога спатрэбілася жыхарцы Мсціслаўскага раёна. Яшчэ 9 гадоў таму яна купіла хату ў вёсцы Лютня, а прапісацца не можа. Той, хто прадаў ёй гэты дом, жыве ў Расіі і не спяшаецца ўрэгуляваць юрыдычныя моманты. Жанчыне між тым прыходзіцца плаціць за паслугі ў двайным памеры.

Не менш складаная жыццёвая сітуацыя склалася ў магіляўчанкі. Жанчына не можа прыватызаваць кватэру з-за таго, што на яе метрах прапісаны сын, які адсутнічае болей за 20 гадоў. Сувязі з маці ён не падтрымлівае. Неабходна прайсці працэдуру прызнання яго памерлым, а тэрмін, адведзены насельніцтву для прыватызацыі жылля, падыходзіць да завяршэння. Між тым у жанчыны ёсць яшчэ дзеці, якім яна хацела б пакінуць спадчыну.

Усяго на суботнюю «прамую лінію» паступілі 22 звароты.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*

■

■ Пра гэта сказана ў Праграме пяцігодкі

# РЫНАК ПРАЦЫ — ПАД КАНТРОЛЕМ

**Забяспечыць эфектыўную занятасць насельніцтва — адна з прыярытэтных дзяржаўных задач. Шмат увагі пытанням працаўладкавання плануюць надаваць і ў наступную пяцігодку. Пра актуальнасць захадаў у сферы занятасці, прадугледжаных праектам Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016—2020 гады, расказвае першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Андрэй ЛАБОВІЧ.**

***— Андрэй Валянцінавіч, згодна з праектам праграмы, афіцыйна зарэгістраванае беспрацоўе будзе ўтрымлівацца ў межах двух працэнтаў ад колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва. Наколькі сёння ўдаецца рэгуляваць гэты паказчык?***

— У выніку рэалізацыі палітыкі занятасці ў Беларусі захоўваецца кантраляваная сітуацыя на рынку працы. Узровень зарэгістраванага беспрацоўя на працягу 10 гадоў утрымліваецца ў сацыяльна дапушчальных межах — да 1,5 працэнта ад эканамічна актыўнага насельніцтва, а ў 2012—2014 гадах — 0,4-0,5 працэнта. Сёння ўзровень беспрацоўя хоць і крыху павялічыўся да 1,1 працэнта, ён у нас адзін з самых нізкіх у СНД. У Расійскай Федэрацыі на канец красавіка 2016-га гэты паказчык складаў 1,4 працэнта.

Цяперашні ўзровень беспрацоўя з'яўляецца аптымальным для развіцця канкурэнцыі за працоўнае месца, што стымулюе работнікаў павышаць свой прафесіяналізм. Пры гэтым наймальніку прадастаўлена магчымасць выбару найбольш кваліфікаваных кадраў.

***— Праграма таксама абяцае стварыць максімальна спрыяльныя ўмовы для самазанятасці насельніцтва...***

— Сёння грамадзяне зацікаўлены ў адкрыцці сваёй справы, а служба занятасці дапамагае ім у гэтым. Дзейным заканадаўствам вызначаны формы і парадак садзейнічання беспрацоўным у арганізацыі прадпрымальніцкай і рамесніцкай дзейнасці, дзейнасці ў сферы агра- і экатурызму. Беспрацоўным прадастаўляюцца субсідыі ў памеры 11-разовай велічыні бюджэту пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва, а калі яны пражываюць у малых гарадах з высокім узроўнем напружанасці на рынку працы ці ў сельскіх населеных пунктах — 15 БПМ. Калі ж будучая прадпрымальніцкая дзейнасць звязана з укараненнем навуковых даследаванняў і распрацовак, памер субсідыі роўны 20 БПМ.

За перыяд з 2011 года фінансавую падтрымку ў арганізацыі ўласнай справы атрымалі каля 12 тысяч беспрацоўных.

***— Сярод задач на наступную пяцігодку — павышаць мабільнасць рабочай сілы, пераразмяркоўваць кадры ў рэгіёны з дэфіцытам працоўных рэсурсаў. Як сёння наладжана гэта дзейнасць?***

— У мэтах стымулявання працоўнай мабільнасці грамадзян створаны Агульнарэспубліканскі банк вакансій, у якім акумулююцца звесткі аб наяўнасці свабодных месцаў на прадпрыемствах рэспублікі, у тым ліку і з магчымасцю прадастаўлення жылога памяшкання. Банк вакансій дынамічны, яго актуалізацыя адбываецца некалькі разоў на дзень.

Функцыянуе механізм па перасяленні грамадзян з ліку беспрацоўных і членаў іх сем'яў на новае месца жыхарства і працы з прадастаўленнем наймальнікам жылля. Беспрацоўным, якія заключаюць адпаведны дагавор са службай занятасці і прадпрыемствам, выплачваюць грашовыя сродкі ў памеры 7-разовай велічыні БПМ, а пры перасяленні з гарадоў у малыя і сярэднія гарадскія паселішчы, у сельскую мясцовасць, а таксама ў гарады-спадарожнікі — у памеры 9 БПМ. Апроч таго, кампенсуюць выдаткі на праезд беспрацоўнага і членаў яго сям'і (затраты на праезд, перавозку маёмасці, сутачныя за час знаходжання ў дарозе).

За мінулую пяцігодку матэрыяльную дапамогу ў перасяленні на новае месца жыхарства і працы атрымалі амаль 1,5 тысячы сем'яў незанятых грамадзян.

У цэлым рэалізацыя Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016—2020 гады будзе скіравана на далейшае забеспячэнне збалансаванасці попыту і прапановы рабочай сілы, павышэнне якасці працоўных рэсурсаў і росту канкурэнтаздольнасці спецыялістаў. Плануецца стымуляваць эканамічную актыўнасць насельніцтва і ўцягваць у працоўную дзейнасць інвалідаў, жанчын, якія маюць малалетніх дзяцей, павышаць прэстыж рабочых прафесій сярод моладзі.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

# ДА АПОШНЯГА КЛІЕНТА

## ЗАЯВЫ 30 ЧЭРВЕНЯ БУДУЦЬ ПРЫМАЦЬ ДА 24.00

Прыватызацыя жылых памяшканняў доўжыцца ў Беларусі 24-ы год, бо першая дзяржаўная кватэра атрымала статус прыватнай яшчэ ў 1993 годзе. У гэты час у прыватызацыі назіралася некалькі ўсплёскаў актывізацыі, напрыклад, калі ў 1998—1999 гадах зрабіць такое пераафармленне было найбольш танна, або — у 2007 годзе, калі заканчваўся тэрмін перарэгістрацыі чэкаў «Жыллё». Сёлета насельніцтва таксама заварушылася, бо ў гэтым працэсе вырашылі паставіць кропку.

**Самы вялікі кошт прыватызацыі быў разлічаны ў Мінску для пяціпакаёвай кватэры. Агульная сума прыватызацыі такой кватэры ў доме 2006 года пабудовы складзе каля 2,4 млрд рублёў.**

Паводле інфармацыі **намесніка міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі Генадзя ТРУБІЛЫ,** па стане на сярэдзіну чэрвеня ў краіне яшчэ застаюцца непрыватызаванымі каля 160 тысяч жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду з уліку жылля, якое падлягае прыватызацыі. Атрымліваецца, што прыкладна 93% існуючага жыллёвага фонду знаходзіцца ва ўласнасці грамадзян. Аднак астатнія 7% застаюцца даволі ўнушальнай лічбай, таму спецыялісты камунальнага сектара з другой дэкады чэрвеня вырашылі пісьмова інфармаваць аб гэтым тых жыхароў жылля, якія за ліпень пачнуць плаціць не толькі па стаўцы камунальных тарыфаў, але і за арэнду дзяржаўнага фонду.

Аднак пакуль нейкай сур'ёзнай актыўнасці з боку будучых уласнікаў нерухомасці спецыялісты не назіраюць. Магчыма, што большасць карыстальнікаў дзяржаўнага жылля пачнуць масава несці адпаведныя заявы менавіта ў апошнія дні чэрвеня. Таму Мінжылкамгас прапанаваў сваім арганізацыям забяспечыць прыём дакументаў у будні і выхадныя дні да 20.00, а ў апошнія дні месяца, з 27 па 30 чэрвеня ўключна, — з 6.00 да 24.00. Такім чынам, Генадзь Трубіла запэўніў, што ў гэты дзень іх службы будуць працаваць да апошняга кліента, які вырашыць скарыстацца сваім правам па прыватызацыі жылля.

## ТРЫ КРОКІ ДА ПРЫВАТНАЙ КВАТЭРЫ

Каб грамадзянін мог сказаць, што гэта кватэра ўжо яго, трэба выканаць пэўныя аперацыі. На першым этапе ён павінен звярнуцца з заявай і атрымаць рашэнне аб прыватызацыі. Другім крокам стане вызначэнне цаны жылля, аплата 10% гэтай сумы і атрыманне натарыяльна засведчанага дагавора прыватызацыі. «На трэцім этапе чалавек звяртаецца з гэтым дагаворам у адпаведную арганізацыю (агенцтва) па дзяржаўнай рэгістрацыі, якая правядзе рэгістрацыю дакумента аб прыватызацыі і засведчыць права грамадзяніна на кватэру, — растлумачыў сітуацыю **намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Вячаслаў АБРАМАЎ.** — Вось калі такія рэгістрацыйныя дзеянні будуць праведзены, тады грамадзянін з'яўляецца і ўласнікам кватэры. Да гэтага пры наяўнасці натарыяльна засведчанага дагавора на прыватызацыю чалавек з'яўляецца кандыдатам у праваўладальнікі, але кватэра застаецца дзяржаўнай».

## ЗВАННЕ ЎЛАСНІКА КАШТУЕ ГРОШАЙ

Пасля падачы заявы на прыватызацыю адпаведная камісія вызначае ацэначны кошт жылля. Гэта робіцца з улікам спажывецкіх якасцяў аб'екта ў цэнах, якія дзейнічаюць на дзень падачы заявы аб прыватызацыі, расказвае Вячаслаў Абрамаў. Трэба адзначыць, што ацэначны кошт цалкам не адлюстроўвае рэальнага кошту жылога памяшкання, які цяпер склаўся на рынку нерухомасці, а паказвае прыведзеную да бягучага ўзроўню цэн суму выдаткаў, панесеных на яго стварэнне, якая паменшана на велічыню назапашанай амартызацыі.

Калі вызначаная сума кошту жылля для прыватызацыі будучаму ўласніку здасца занадта вялікай, то ён мае права да прыняцця рашэння аб прыватызацыі звярнуцца па правядзенне незалежнай ацэнкі рыначнага кошту свайго жылля. Пры гэтым рыначны кошт паказвае камерцыйную цану кватэры. Пры такой ацэнцы ўлічваюцца асаблівасці і характарыстыкі жылога памяшкання, такія як год пабудовы дома, наяўнасць камунікацый, матэрыял сцен дома, фактычны стан жылога памяшкання, геаграфічнае месцазнаходжанне яго і іншыя фактары, якія ўплываюць на канчатковую цану. Пасля гэтага будучы ўласнік мае права ажыццяўляць прыватызацыю свайго жылля па найменшым ацэначным альбо рыначным кошце.

Звычайна ацэначны кошт кватэр у буйных гарадах істотна меншы за рыначны. Але і тут часам бываюць астранамічныя сумы. Напрыклад, самы вялікі кошт прыватызацыі быў разлічаны ў Мінску для пяціпакаёвай кватэры агульнай плошчай 151 квадратны метр. Там ацэначны кошт квадратнага метра кватэры склаў каля 16 млн рублёў. Агульная сума прыватызацыі такой кватэры ў доме 2006 года пабудовы складзе каля 2,4 млрд рублёў. Заплаціць адразу ўсю суму прыватызацыі такой кватэры будзе і сапраўды складана, але існуе выйсце. Пры прыватызацыі жылля можна адразу аплаціць толькі 10% ад сумы, а астатнюю частку ўзяць у банку ў растэрміноўку тэрмінам да 40 гадоў з дадатковай аплатай 1% гадавых.

## АТРЫМАЦЬ СТАТУС САЦЫЯЛЬНАГА

Генадзь Трубіла кажа, што магчымасць уключэння жылога памяшкання камерцыйнага выкарыстання ў склад жылля сацыяльнага статусу жыхары кватэр атрымаюць ужо толькі ў ліпені. Падобная «ракіроўка» статусу кватэры робіцца па заяве наймальніка памяшкання і робіцца толькі тым асобам, якія маюць права на атрыманне жылога памяшкання сацыяльнага карыстання. Такое права маюць людзі, што стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, жылыя памяшканні якіх (у тым ліку тыя, якія належаць ім на праве ўласнасці) з-за надзвычайных сітуацый прыроднага і тэхнагеннага характару, баявых дзеянняў і тэрарыстычных акцый сталі непрыдатнымі для пражывання.

Да гэтай катэгорыі адносяцца таксама грамадзяне, якія маюць захворванні, і тыя, у складзе сем'яў якіх ёсць дзеці, якія маюць захворванні, названыя ў пераліку, што вызначаецца Міністэрствам аховы здароўя, пры наяўнасці якіх прызнаецца немагчымым іх сумеснае пражыванне з іншымі асобамі ў адным пакоі або аднапакаёвай кватэры; дзеці-сіроты і дзеці, што засталіся без апекі бацькоў, у дачыненні да якіх прынята рашэнне аб эмансіпацыі або якія ўступілі ў шлюб; Героі Беларусі, Героі Савецкага Саюза, Героі Сацыялістычнай Працы, поўныя кавалеры ордэнаў Славы, Працоўнай Славы; ветэраны і інваліды Вялікай Айчыннай вайны і інваліды баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў; іншыя катэгорыі асоб у адпаведнасці з заканадаўствам. Пры пераводзе жылога памяшкання камерцыйнага выкарыстання ў сацыяльнае жыллё плата за карыстанне такім памяшканнем налічвацца не будзе.

## У РЭГІЁНАХ АРЭНДА ЗНАЧНА МЕНШАЯ

Паводле папярэдніх падлікаў спецыялістаў Мінжылкамгаса, пасля 1 ліпеня ў ранг арэнднага жылля ў межах краіны трапіць мінімум каля 70 тысяч кватэр, якія так і не будуць прыватызаваныя насельніцтвам. Таму ў жніўні менавіта па такім жыллі плата за карыстанне кватэрай будзе ўключацца ў жыроўку за ліпень. Цікава, а аб якіх сумах ідзе гаворка?

Генадзь Трубіла паведаміў, што іх спецыялісты падлічылі сярэднюю суму за карыстанне жылым памяшканнем двухпакаёвай кватэры плошчай каля 50 квадратных метраў у Оршы. У гэтым выпадку ў жыроўцы з'явіцца новы радок на 84 тысячы рублёў. Зразумела, што ў сталіцы плата за карыстанне дзяржаўнай кватэрай будзе большай.

Нават у межах сталіцы такая стаўка за карыстанне дзяржаўнымі метрамі будзе неаднолькавай для жыхароў дамоў з розных планава-эканамічных зон, паведаміў карэспандэнту «Звязды» **начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Мінгарвыканкама Аляксандр АЎРАМЕНКА.**

— Многія непакояцца, што арэндная плата істотна ўдарыць па кашальку. Хачу супакоіць грамадзян, якія з якіх-небудзь прычын адмовіліся ад прыватызацыі жылля. Пры розніцы арэнднай платы да існуючых тарыфаў будзе прымяняцца паніжальны каэфіцыент 0,2, — удакладніў гарадскі чыноўнік.

Напрыклад, калі сёння наймальнік арэнднага жылля плаціць за аднапакаёвую кватэру ў пятай эканоміка-планіровачнай зоне (напрыклад, у Шабанах) 700-800 тысяч рублёў у месяц, то для гараджан, чыё жыллё з 1 ліпеня пяройдзе ў разрад дзяржаўнага арэнднага жылля, гэтыя плацяжы складуць 140-160 тысяч. Тут трэба нагадаць, што каэфіцыент 0,2 па арэндзе выкарыстоўваецца толькі для тых, хто атрымліваў жыллё ад дзяржавы даўно і на агульных падставах, а не ў якасці арэнднага.

Разам з тым, у Цэнтральным раёне Мінска сёння існуе жыллё, па якім арэндная плата без ільготы складае ў межах ад 1,8 млн да 3 млн рублёў. Для старажылаў такога жылля без прыватызацыі арэнда будзе вагацца ад 350 тысяч да 600 тысяч рублёў.

## ЗАРЭГІСТРАВАЦЬ СВАЁ ПРАВА КАНЧАТКОВА

Вячаслаў Абрамаў яшчэ раз вырашыў нагадаць пра тое, хто яшчэ будзе плаціць арэнду. Так, грамадзяне, якія маюць натарыяльна засведчаны дагавор прыватызацыі жылля, але не афармілі гэты дакумент аб дзяржаўнай рэгістрацыі і не зарэгістравалі яго, з 1 ліпеня будуць плаціць за карыстанне сваім жыллём да таго часу, пакуль юрыдычнае права на нерухомасць не будзе перапісана менавіта на жыхара. Надалей, паводле яго слоў, калі рэгістрацыйныя дзеянні будуць учынены, тады грамадзянін стане ўласнікам кватэры і перастане плаціць за карыстанне ёю. Без адпаведнай паперкі ў нас ніяк...

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# БЕЛАРУСЬ МЫ Ў АДКАЗЕ ЗА ПРАЎДУ

**«Круглы стол» «Беларусь і Расія: мы ў адказе за праўду аб вайне» напярэдадні 75-й гадавіны пачатку Вялікай Айчыннай адбыўся ў канферэнц-зале «Звязды». Якім чынам супрацьстаяць фальсіфікацыям і як агульнымі намаганнямі захаваць памяць аб падзеях больш чым 70-гадовай, разважалі дырэктар Дзяржаўнага музея ваеннай гісторыі Рэспублікі Беларусь Сяргей АЗАРОНАК, сустаршыня агульнарасійскага грамадскага грамадзянска-патрыятычнага руху «Бессмяротны полк Расіі» Мікалай ЗЯМЦОЎ, кіраўнік выканкама агульнарасійскага грамадскага грамадзянска-патрыятычнага руху «Бессмяротны полк Расіі» Алена КАЛГІНА, вядучы спецыяліст упраўлення па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў Узброеных Сіл Беларусі Аляксандр ЛУГІН, лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне», доктар гістарычных навук, аўтар кніг на ваенную тэматыку Анатоль ШАРКОЎ.**

## Галоўнае — казаць праўду

***— Нівеліраванне памяці пра Вялікую Айчынную вайну паступова становіцца нормай для сусветнай супольнасці. Як змагацца з фальсіфікацыямі гісторыі?***

Мікалай ЗЯМЦОЎ.

**Мікалай ЗЯМЦОЎ:** — Тры гады таму я пахаваў бацьку, які з'яўляўся носьбітам ведаў пра вайну. Ён быў ветэранам, вызваляў Маскву, прарываў блакаду Ленінграда, знішчыў нямецкую калону, прамой наводкай расстраляўшы яе з рэактыўнага міномёта «Кацюша». А пэўныя людзі, разумныя, з добрай адукацыяй, абсалютна цынічна аспрэчваюць Перамогу, якую савецкі народ атрымаў за чатыры найцяжэйшыя гады, прынёсшы на яе алтар вялікія ахвяры. Гэта была самая кровапралітная вайна, і подзвіг тады быў нормай.



Анатоль ШАРКОЎ.

**Анатоль ШАРКОЎ:** — Мой бацька таксама ваяваў, быў адным з арганізатараў партызанскага руху на тэрыторыі Беларусі. Я вырас на яго аповедах. Тады ўсе беларусы, якія засталіся з мужчынскага насельніцтва, былі ўдзельнікамі вайны. І ў кожнага была свая праўда. І пра тую Перамогу, што нехта заваяваў яе акрамя іх, нават размовы не магло быць. Але час ідзе. І подзвіг савецкага народа не тое што пачынаюць забываць, а збіваюць са свядомасці тых, хто памятае. Ажно да таго дайшло, што ўраўноўваюць Сталіна з Гітлерам, Савецкі Саюз з нацысцкай Германіяй. І нават віну ў развязванні вайны некаторыя спрабуюць павесіць ледзь не на Савецкі Саюз. Камусьці выгадна так падаваць гісторыю, прыніжаць нашу ролю ў Перамозе над фашызмам.

Сяргей АЗАРОНАК.

**Сяргей АЗАРОНАК:** — У свой час у складзе дэлегацыі я прысутнічаў на адкрыцці Музея саюзнікаў у Берліне. І мы былі абураны лагатыпам гэтай установы. Звярніце ўвагу (Сяргей Іванавіч паказвае фотаздымак лагатыпа. — **Аўт.**), тут ёсць сцягі ўсіх пераможцаў, акрамя Савецкага Саюза. Заўважыўшы наша абурэнне, нам патлумачылі, што такой краіны ўжо не існуе. Вось вам відавочны прыклад нівеліравання Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

Аляксандр ЛУГІН.

**Аляксандр ЛУГІН:** — Нівеліраванне памяці аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны з боку заходняй прапаганды — аб'ектыўная рэальнасць. І нам, вядома, трэба знаходзіць новыя формы і метады барацьбы з гэтай з'явай. Каб змагацца з фальсіфікацыямі гісторыі, у першую чаргу, трэба ісці ад сям'і. Калі ў кожнай сям'і дзеці і ўнукі будуць ведаць, хто ў гады вайны быў іх бацька і дзед, як яны ваявалі, якія ўзнагароды мелі, то нам няма чаго баяцца. На шчасце, усю інфармацыю сёння можна знайсці ў інтэрнэце.

Алена КАЛГІНА.

**Алена КАЛГІНА:** — Заўсёды прыемна, калі старэйшае пакаленне асвятляе любыя пытанні праз сваю асабістую гісторыю. Нават большасць з людзей, якія ўдзельнічаюць у «круглым стале», пачынаюць аповед пра сваіх продкаў. І лічаць важным расказаць усім навакольным, што і ў іх сям'і былі такія людзі, якія ўнеслі свой уклад у Вялікую Перамогу.

**Анатоль Шаркоў:** — Усе мы сочым за сродкамі масавай інфармацыі, бываем за мяжой і бачым, што адносіны да нашых людзей, якія вызвалілі Еўропу, перамаглі нацызм і заваявалі Перамогу ў гэтай вайне, мяняюцца. Помню, калі яшчэ маленькім удалося пабываць у краінах сацлагера, там былі зусім іншыя размовы. Пасля вядомых падзей усё вельмі памянялася. Ужо аплёўваюць тое, што зрабілі, заслужылі салдаты Чырвонай Арміі — уласна кажучы, нашы бацькі і дзяды.

**Што такое Перамога? Гэта ж не матэрыяльная каштоўнасць. Гэта выснова розуму. Дастаткова памяняць у свядомасці гэтае паняцце, дэвальваваць, змяніць яго — і мы ўжо не спадчыннікі Перамогі.**

**Мікалай ЗЯМЦОЎ:** — Перамога бясспрэчна з'яўляецца здабыткам нашых народаў. Але ўсё гэта цынічна выкарыстоўваецца для таго, каб гэтая рэпутацыя і гэтыя факты служылі на карысць іншым нацыям. Нічым іншым, як крадзяжом, я гэта назваць не магу. І не магу зразумець, як можна ўзяць фотаздымак, на якім адлюстраваны Сталін, Чэрчыль і Рузвельт, і проста адрэзаць ад яго нашага Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, казаць, што яны вызвалілі Еўропу і абсалютна спакойна выхоўваць на гэтым падрастаючае пакаленне. Вось і выросла тое пакаленне людзей, якое мае абсалютна перавернутае ўяўленне аб гісторыі.

**Сяргей АЗАРОНАК:** — Калі скончылася «халодная вайна», усе народы ўздыхнулі з палёгкай. Здавалася, нарэшце ўсе погляды людзей будуць накіраваны да міру. Але калі разабрацца з вышыні сённяшняга часу, «халодная вайна» скончылася, але яе нябачную частку мы можам назіраць сёння ў выглядзе інфармацыйнай вайны. Асіметрычная вайна ў сферы сэнсаў, яна ўжо прыносіць свае перамогі, якія, на жаль, не на нашым баку. Развал Савецкага Саюза, распад Варшаўскага дагавора, выгнанне вызваліцеляў з тэрыторыі краін Усходняй Еўропы — гэта перамогі нашых інфармацыйных працаўнікаў у інфармацыйнай вайне. Зараз яна пераходзіць у найбольш вострую фазу, і нам трэба быць гатовымі да гэтага.

**Аляксандр ЛУГІН:** — Таму ўвесь час трэба казаць праўду. Асабліва якой крывёй і якімі стратамі дасталася нам Перамога. А то пачынаеш чуць такога роду выказванні: не так шмат насельніцтва і забілі, фашысты не лютавалі, а цукеркі давалі... Мы, калі праводзім пошукавыя работы на тэрыторыі Беларусі, дагэтуль сутыкаемся з жудаснымі фактамі. Асабліва ўражваюць месцы пахаванняў ваеннапалонных. Напрыклад, цяпер мы вядзём раскопкі ў Барысаве, на месцы 382-га лагера. Паглядзіце самі (паказвае фотаздымак, зроблены падчас раскопак. — **Аўт.**): трупы салдат складзены штабялямі, магіла паўтара на два метры, а там — па 18—20 чалавек. Вось аргумент тым, хто апраўдвае фашысцкіх злачынцаў. А ўсяго на тэрыторыі Беларусі было 260 лагераў для ваеннапалонных і грамадзянскага насельніцтва. Пяты год мы капаем на месцы лагера ў Гродне і, напэўна, яшчэ эксгумавалі не апошняга салдата. На сённяшні дзень знойдзены астанкі больш як чатырох тысяч савецкіх салдат. Вось пра што трэба казаць, вось што трэба паказваць.

**Анатоль ШАРКОЎ:** — Напэўна, нам трэба такія фотаздымкі больш публікаваць і прадстаўляць у сродках масавай інфармацыі. І калі казаць пра пэўны гістарычны факт, то пацвярджаць свае словы дакументальна. Ужо столькі дакументаў прайшло праз мае рукі, але часам чытаеш і дзіву даешся: няўжо людзі маглі здзекавацца так з людзей? І самае жудаснае, што ў асноўным са сваіх суайчыннікаў.

## Асноўны рэсурс — нашчадкі пераможцаў

***— Як захаваць памяць пра падзеі больш як 70-гадовай даўніны агульнымі намаганнямі?***

**Мікалай ЗЯМЦОЎ:** — Прыйшоў час, калі трэба ўкараняць тыя факты, якія ёсць у нас, у тыя тэхналогіі, якія ўспрымаюцца як маладзёжнай аўдыторыяй, так і сусветнай грамадскасцю ў цэлым. У першую чаргу, гэта кінематаграфія, інтэрнэт і ўсемагчымыя публікацыі, у тым ліку кнігі. Я думаю, што дарэчы на дзяржаўным узроўні Беларусі і Расіі стварацца нейкае напаўненне нашай Саюзнай дзяржавы, якое магло б каардынаваць народы нашых дзвюх краін. Мы бралі б гэтыя неверагодныя гістарычныя факты і кансалідавана даводзілі б іх да аўдыторыі ў зручнай для яе форме. У пэўнай ступені мы гэтымі тэхналогіямі авалодалі. Нам засталося толькі аб'яднацца.

**Беларуска-расійскія пляцоўкі маглі б стаць цэнтрам збору той часткі Еўропы, якая не хоча быць апранута ў шынель неафашызму.**

**Анатоль ШАРКОЎ:** — Пастаянна ідзе знішчэнне памяці. Узяць хоць бы такія носьбіты памяці, як помнік або воінскае пахаванне. У Еўропе іх захавалася нямала. Але мы бачым, што адбываецца ў той жа Польшчы, дзе знеслі помнік Чарняхоўскаму. А ён, між іншым, разам са сваім войскам вызваляў гэтую краіну. Вядома, лепш прыбраць, а потым можна казаць, што хочаш. Помнікі пераносяць, прыдумаўшы зручную прычыну, маўляў, сабраць у адно месца, магчыма, каб потым у адным месцы і знішчыць. Я разумею, ёсць сітуацыі, калі астанкі салдат неабходна эксгумаваць, але ў такім выпадку перапахаваць іх трэба ў годным месцы. І калі мы гэтыя носьбіты памяці пусцім на самацёк, калі не будзем пра іх казаць, ка-

# І РАСІЯ: АБ ВАЙНЕ

лі не створым кінастужкі, выстаўкі, кнігі, то ўсё страцім. І тут вельмі дарэчы аб'яднаць намаганні Беларусі і Расіі, іншых дзяржаў, якія аб'ектыўна ставяцца да гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Толькі сумеснымі намаганнямі можна нешта зрабіць у імя захавання памяці аб вайне, аб тым, што нам расказвалі нашы бацькі і дзяды.

**Сяргей АЗАРОНАК:** — Адным з захавальнікаў памяці з'яўляюцца музеі. І магчыма, неабходна таксама аб'яднаць намаганні ў працы над тым праектам, аб якім я раскажу. Музей ваеннай гісторыі Беларусі і фонд «Культурная спадчына і сучаснасць» стварылі выставу, сэнс якой наладзіць дыялог паміж дзецьмі вайны (юнгамі, сынамі палкоў, малалетнімі вязнямі і непаўналетнімі працаўнікамі тылу, якія ставілі скрыні, каб дацягнуцца да станка, на якім апрацоўвалі міны, што потым ішлі на фронт) і дзецьмі міра, якія прадстаўляюць сучаснае пакаленне. Гэты дыялог паміж дзецьмі вайны і тымі, хто не ведае аб вайне, але жыве ў арэоле памяці аб ёй, паказаны праз выставачны праект. Іх успаміны, думкі мы ўжо пачынаем змяшчаць у інтэрнэце. Сімвалічна, што гэтая выстава адкрылася не толькі ў Маладзечне, культурнай сталіцы Беларусі, а і ў Маскве, на ВДНГ. Мы таксама запісалі выказванні маленькіх масквічоў аб вайне. І цікава, што расійскія і беларускія дзеці кажуць адно і тое ж — слова ў слова. Таму вельмі важна, калі ваенная гісторыя Беларусі кансалідуецца з нашымі бліжэйшымі саюзнікамі і братамі.

**Алена КАЛГІНА:** — Мы вельмі шмат кажам пра выхаванне падрастаючага пакалення. Але ў асноўным гаворым пра маладых. У той жа час больш старэйшае пакаленне таксама трэба выхоўваць і заклікаць да захавання памяці, бо калі мы будзем накіроўваць свае сілы толькі на дзяцей, а яны будуць вяртацца ў сем'і, дзе не шануюць традыцыі сваіх продкаў, уся праца не прынясе карысці.

**Аляксандр ЛУГІН:** — Я лічу, што ў кожнай сям'і павінен быць куток, які б расказваў аб гераізме продкаў. Ды і 9 Мая трэба адзначаць як належыць, а 22 чэрвеня нагадваць, чаму мы лічым гэты дзень днём смутку і колькі людзей загінула ў той жудаснай вайне. Я зрабіў партрэты свайго дзеда і дзеда жонкі, размясціў іх на сваёй старонцы ў сацыяльных сетках з удзячнасцю. Мой дзед — удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, партызан, ваяваў і ў фінскую. Дзякуй Богу, вярнуўся, нешта паспеў расказаць. Быў бы я больш дарослым, распытаў бы больш. Але і яны былі нешматслоўныя...

**Мікалай ЗЯМЦОЎ:** — Сапраўды, самая вялікая спадчына захоўваецца ў сем'ях. І нам трэба прад'явіць яе свету. Калі Сяргей Іванавіч паказаў лагатып з сімволікай краін-саюзніц, але без СССР, я не здзівіўся. Разумею, што гэта выстрал. Таму нам неабходны свае выстаўкі ў Еўропе, дзе будуць паказаны тыя сведчанні, якія патрэбны нам. І я спадзяюся, што, пачынаючы з наступнага года, сумесныя беларуска-расійскія выстаўкі пройдуць у Еўропе. Прычым ёсць магчымасць правесці іх з аншлагам. І гэта будзе да вялікага задавальнення той часткі Еўропы, якая захавала памяць, якая, як і мы, абураецца гэтым нахабным перайначваннем гісторыі. Такія людзі ў Еўропе яшчэ ёсць. Часцяком гэта нашчадкі воінаў антыгітлераўскай кааліцыі. Ім трэба падставіць плячо, даць глыток свежага паветра. І беларуска-расійскія пляцоўкі маглі б стаць цэнтрам збору той часткі Еўропы, якая не хоча быць апранута ў шынель неафашызму. Час прыйшоў. Мы палічылі, што каля 300 мільёнаў чалавек на прасторы Еўразіі з'яўляюцца нашчадкамі савецкіх салдат. Гэта наш не да канца ўсвядомлены рэсурс.

Перажыванні скончыліся тым, што надвор'е стала сонечным, фатограф прыехаў да маёй хрушчоўкі. Дарэчы, апошнюю я вельмі палюбіў падчас блуканняў на балоце, але пра гэта ніжэй.

У гімназіі-інтэрнаце ў вёсцы Лескавічы Шумілінскага раёна «Звяздзе» былі рады. Потым ужо на балоце паабяцалі выпісаць экзэмпляр. А нас парадавала, што канкурэнтаў (са СМІ) было двое. Мой цёзка з раённай газеты і тэлевядучы Максім Нямчынаў, які прыехаў без здымачнай групы.

Патэнцыйныя «балотныя людзі» сядзелі ў камп'ютарным класе ля маніторaў. І ў мяне нарадзілася слабая надзея, што мо і прасядзім тут да вечара? Але...

— Тут сабраліся захавальнікі тэрыторыі, важнай для птушак. Калі кароткa, тутэйшыя будуць назіраць за птушкамі, якія жывуць на балоце, у рэспубліканскім ландшафтным заказніку «Казьянскі», — сказала **Ірына КУЛІКОВА, педагог дадатковай адукацыі, кіраўнік аб'яднання па інтарэсах «Зялёная школа»** (аказалася, што яе прозвішча ў дзявоцтве — Ястрабава).

Яна адна з тых, хто рэалізуе праект «Прырода важная для ўсіх. Узмацненне прыроды праз развіццё лідарства і ўдзел мясцовага насельніцтва ў працэсе прыняцця рашэнняў на мясцовым узроўні». Праект рэалізуецца ГА «Ахова птушак Бацькаўшчыны» пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага саюза.

На сайце www.iba.ptushki.org можна зарэгістравацца ў якасці захавальніка. Рэсурс дапамагае спецыялістам вывучаць і захоўваць тэрыторыі, важныя для птушак. У цэнтры ўвагі і ласасёвыя, якія мігруюць праз Беларусь. Такім чынам кожны можа стаць актыўным аматарам прыроды.

### Крок улева...

На школьным аўтобусе мы ехалі да балота Обаль-2 хвілін 50. Ёсць і Обаль-1, дзе здабываюць торф. А «наша» на сёння прыкладна такое, якім было ў ледавіковы перыяд.

— Балота цягнецца на 10-15 кіламетраў у розныя бакі. Калі плошча заказніка больш за 26 тысяч га, балота — каля 8 тысяч. Яно ўнікальнае па некалькіх паказчыках. Напрыклад, унутры яго знаходзяцца сотні азёраў. Тут шмат рэдкіх прадстаўнікоў раслiннага і жывёльнага свету. Калі наўскідку, каля 90% — з Чырвонай кнігі. Ёсць таксама мядзведзі, рысі і барсукі, — расказаў **дырэктар заказніка «Казьянскі» Васіль ВІНАКУРАЎ.**

Наш маршрут быў накіраваны на востраў. Дырэктар растлумачыў, што з часам балота «бярэ верх» над азёрамі, былыя вадаёмы становяцца астравамі, але балотнымі.

Ісці да вострава з непрывычкі было вельмі цяжка. Крок улева, управа — вераголнасць праваліцца ў багну. У галаве круцілася песня з фільма «Аперацыя «Ы»: «Мяне засмактала небяспечная багна». Заядлы курыльшчык, я хвілін праз 20 пачаў задыхацца. Пад нагамі калючыя расліны, галінкі і дрэўцы. Хадзіць непрыемна і складана.

### «Залатое вока»

Гарадскім і вясковым птушкам робяць шпакоўні. Балотным і лясным — штучныя гняздзішчы.

— Гогаль звычайны — адзін з 15 відаў качак, што гняздуюцца ў Беларусі. Паляванне на яго забаронена. Англічане звярнулі ўвагу на жоўтыя вочы птушкі і назвалі яе goldeneye (у перакладзе — «залатое вока»). Сёлета ён птушка года. Гэта і нагода, каб больш актыўна дапамагаць гогалю «спраўляць навасeлле», — тлумачыць **Максім НЯМЧЫНАЎ, вядучы папулярнай праграмы Terra incognita канала «Беларусь 1» «Беларусь невядомая».** Ён працуе ў грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» каардынатарам захавальнікаў тэрыторый, важных для птушак.

Падчас балотнага падарожжа быў экспертам, бо ён яшчэ і арнітолаг.

У прыродзе гогаль гняздуецца ў дуплах каля вадаёма. Для жылля неабходны спарахнелыя і гнілыя, «дзіравыя» дрэвы, якіх застаецца ўсё меней. А пабудаваць гняздо і вывесці птушанят на зямлі, як іншыя качкі, гогаль не можа. Таму ім патрэбны «домікі», як для шпакоў і сініц. Вось і робяць арнітолагі і іх памагатыя гнездзішчы і развешваюць каля вадаёмаў. Каб дапамагчы гогалю вывесці птушанят.

— Штучныя гнездзішчы даўно шырока практыкуюцца арнітолагамі. Але масавасці гэта не насіла. Будавалі трохі «домікаў» для соў і іншых птушак. Але не хапае людзей, якія ведаюць як і што рабіць, — працягвае Максім.

Знаўца ў такім будаўніцтве дацэнт Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава Уладзімір Іваноўскі. Ён арнітолаг з сусветнай вядомасцю. На нашых вачах вельмі лёгка залез на сасну вышынёй з чатырохпавярховы дом. Унізе ўдзельнікі экспедыцыі збіралі галінкі, іншыя будаўнічыя матэрыялы. Іх шаноўны Уладзімір Валянцінавіч падымаў на вяроўцы. Пакуль старанна працаваў, мы спрачаліся, колькі ж яму гадоў. Трохі стомлены, ён потым сказаў, што зімой споўніцца 70!

— Як правільна выбраць месца для будаўніцтва і «форму» гнездзішча? Трэба адчуць сябе, як я сёння, гогалем. І так для кожнай птушкі! — дзеліцца вопытам ён. Усяго Іваноўскі зрабіў каля 700 гняздоўяў!

Назад да цывілізацыі ён вяртаўся так спрытна і хутка, як быццам, і не працаваў на вышыні.

### Хутчэй бы асфальт

Дарога назад здавалася асабіста мне пеклам. Але, што дзіўна, даволі хутка сілы аднавіліся. Наогул па сваіх адчуваннях заўважыў, што ў балоце лепш меней адпачываць. Чым больш прывалаў, тым цяжэй ісці. Затое ноччу ўпершыню за апошнія гады заснуў і не ўспомніў пра бессань.

Наступны дзень незвычайнай камандзіроўкі для мяне цягнуўся вечнасць. Цяпер мы ехалі на другі бок балота. І вось яно зноў перад вачыма. Ідзём — і раптам нехта закрычаў. Праваліўся ў багну малады мужчына. Мне пашанцавала.

А нястомны спадар Іваноўскі з дзіравым вядром у руцэ для гнездзішча сокала-дрампюка (дзербніка) усіх супакойваў. Распавядаў пра птушак і расліны.

Мае сілы былі на зыходзе. І тут раптам стала даступнай мабільная сувязь. Тэлефанавала сястра, каб у госці запрасіць. З Камітэта дзяржкантролю, каб прыйшоў на калегію. А начальніца цікавілася, калі ў водпуск збіраюся. Я адразу

Фота Віктара НІКАЛАЕВА.

### І пахудзееш, і асэнсуеш

Перыядычна, хай мяне зразумеюць спадарожнікі правільна, бачыў на балоце «прывідаў». І сабаку Баскервіляў, і нейкую... кавярню. На некаторы час зноў стаў вернікам і гутарыў з нябёсамі.

Праблемай было знайсці месца прысесці. Спадар Іваноўскі раіў шукаць зязюлін лён, бо пад ім параўнальна суха. Як ні шукаў, усё не атрымлівалася. І хутка адчуваў вялігаць месцам, на якім сядзяць.

Тутэйшыя, праўда, «натхнілі» тым, што іншаземцы плацяць вялікія грошы, каб быць на маім месцы. Разам падлічылі. Па маіх падліках, за пару дзён я, калі б эміграваў, патраціў мінімум еўра 100. І гэта без візы і дарогі. А, як кажуць у Адэсе, што не патраціў або сэканоміў, — зарабіў!

У заказніку, дарэчы, рыхтуюць пакет неабходных дакументаў, каб прымаць турыстаў. Трэба стварыць інфраструктуру, каб можна было іх пасяліць, накарміць, забяспечыць бяспеку. На Захадзе вельмі модна назіраць за птушкамі, фатаграфаваць іх. Такім чынам, выдаткі могуць параўнальна хутка акупіцца.

Прыемным сюрпрызам для кіраўніка заказніка стала «адкрыццё» марошкі. Ён ведаў, што яна расце, але не ведаў, дзе менавіта. Па дарозе да лесу мы ледзь не заблукалі. Было весела, хоць зноў сілы амаль што пакінулі. У лесе, як і на балоце, было рухацца яшчэ цяжэй... І вось — о «цуд»! — аўтобус.

Паважаны спадар Іваноўскі ўсім паведаміў, што за маршрут, які мы пераадолелі, ён нам дае тытул «Тыграня балот». А «тыграў» дагэтуль пакуль што было ўсяго два (адзін з іх сам Іваноўскі), бо іх падарожжа ў разы даўжэйшае і складанейшае.

Супрацоўніца заказніка пахвалілася, што пахудзела. І сціпла прадэманстравала вынік, прасунуўшы палец у джынсы. Я падумаў пра тое, што хочуць нашы людзі ехаць за мяжу, па ўражанні ад заморскіх краін, а ў беларускіх балотах былі нямногія. А ўражанняў тут хопіць на ўсё жыццё. І балотнае паветра лечыць, і можна ўбачыць рэдкія расліны, птушак, жывёл. Але самае галоўнае — тут кожны абавязкова пераглядзіць, пераасэнсуе многае са свайго жыцця. Я, напрыклад, ніколі такім стомленым і шчаслівым адначасова не вяртаўся ў сваю кватэру ў хрушчоўцы. Хай не вельмі ўтульна і цесна, але пад нагамі цвёрда.

Усе, часта надуманыя, непрыемнасці, за вушы прыцягнутыя праблемы засталіся ў балоце. Чаго і вам жадаю, як і стаць хаця б на дзень «балотнымі людзьмі».

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*
*Шумілінскі раён*

■

### 5 фактаў пра гогаля звычайнага

❶ *Вясной гогалі аднымі з першых спяшаюцца ў Беларусь з зімовак у Еўропе. Некаторыя застаюцца на зіму і ў нашай краіне: пагуляйце ўздоўж не замёрзлых вадаёмаў.*

❷ *З лютага самцы пачынаюць такаваць — выконваць адмысловы «танец», які прываблівае самак. Качар распускае хвост, закідвае галаву, «бразгоча» голасам і ўздымае вакол сябе фантан пырскаў.*

❸ *Качаняты выскокваюць з дупла на покліч маці. Першы выхад у вялікі свет можа пачацца з 15-метровага скоку! Птушаняты не ўмеюць лётаць і папросту планіруюць, растапырыўшы крылы і перапонкі на лапах.*

❹ *Гогаль харчуецца воднымі насякомымі, ракападобнымі і малюскамі. Ежу здабывае з дна на глыбіні да 10 метраў.*

❺ *У палёце можна пазнаць нават з заплюшчанымі вачыма: у іх па-асабліваму «свішчуць» крылы.*

Алена ЛЯШКЕВІЧ:

# «ЁСЦЬ ГАЛОЎНАЯ МЭТА — ПЕРАМОГА»

## Пра тое, чым адрозніваецца жаночы бокс ад мужчынскага, і якія траўмы атрымліваюць чэмпіёны

**На сёлетнім чэмпіянаце свету па тайскім боксе беларуская зборная заваявала 10 узнагарод (5 залатых, 1 сярэбраную і 4 бронзавыя). Адзінай пераможцай сярод дзяўчат (вагавая катэгорыя да 45 кг) стала Алена Ляшкевіч. Чатыры папярэднія гады яна была другой і вось, нарэшце, здолела заваяваць сусветны памост. У паўфінале спартсменка з Асіповіч адолела шведку Камілу Даніэльсан, а ў вырашальнай сустрэчы адну з фаварытак турніру тайку Супхісару Конлак. У інтэрв'ю карэспандэнту «Звязды» Алена расказвае пра тое, чым даводзіцца ахвяраваць дзеля спорту, як удаецца захоўваць знешнасць дзяўчыны больш падобнай на мадэль і дзеліцца сваімі планамі.**

***— Алена, ужо прайшоў час пасля перамогі, адчулі сваё званне чэмпіёнкі?***

— Толькі цяпер прыходзіць асэнсаванне гэтага. Непасрэдна пасля перамогі і нават тады, калі прыляцела ў Мінск, яшчэ не разумела, што выйграла чэмпіянат свету. Фінальны бой быў з дзяўчынай з Тайланда, я баксіравала з ёй у мінулым годзе і прайграла. Таму гэтым разам выходзіла на паядынак больш падрыхтаванай, ужо ведала яе манеру. Са старту пачала працаваць першым нумарам, з першага раўнда нічога не давала рабіць саперніцы і дабілася поспеху.

***— Можа, былі якія-небудзь прадчуванні перад чэмпіянатам?***

— Сёлета я была як ніколі спакойная, хоць звычайна ёсць хваляванне, цісне адказнасць. На сёлетнім чэмпіянаце свету ўсе беларускія дзяўчаты прайгралі свае першыя баі, таму надзея заставалася толькі на мяне. Напэўна, мой сакрэт поспеху ў тым, каб злавіць вось гэтае адчуванне спакою. Хацелася б сказаць вялікі дзякуй маім трэнерам Сяргею Аляксандравічу Гідуляну, Мікалаю Мікалаевічу Сцяпанаву і Мікалаю Уладзіміравічу Грыгараву, гэта наша агульная перамога.

***— Чатыры гады запар вы на чэмпіянатах свету былі другой, гэта магло зламаць псіхалагічна...***

— Так, ніхто не можа ўявіць, як мне было крыўдна за сябе. Столькі трэніруешся, аддаеш усю сябе спорту, трэнеры столькі ўкладаюць сіл, сама разумееш, што стараешся, а ўсё адно чагосьці не хапае. Усе чатыры разы я была другой па рашэнні суддзяў, гэта значыць, лік быў мінімальны — 3:2. У сэрцы была ўжо вялікая злосць, я думала: калі ж змагу пераламаць гэтую сітуацыю? Перад чэмпіянатам свету моцна захварэла — два разы перанесла ангіну. У нейкі момант наогул думала, што нікуды не паеду, таму асабліва не разлічвала на вынік, але атрымалася ўсё наадварот.

***— Што самае складанае для вас на рынгу?***

— У прынцыпе я ўжо столькі займаюся спортам (больш за 9 гадоў), што з тэхнічнага пункту гледжання ўсё павінна ўмець. Псіхалагічна таксама галава ўжо да ўсяго гатова. Самы складаны момант для мяне, напэўна, заключаецца ў тым, каб сабрацца ў патрэбны момант, таму што бывае, выходзіш на рынг трохі расслаблена, а такога быць не павінна.

***— Жаночы бокс моцна адрозніваецца ад мужчынскага? Магчыма, сярод дзяўчат ёсць нейкія хітрасці?***

— Жаночы і мужчынскі бокс — гэта зусім розныя рэчы. Мужчыны ёсць мужчыны, яны больш агрэсіўныя, у іх па-іншаму пастаўлена тэхніка. У жаночых баях больш сумбуру, асабліва ў маленькіх вагах. А што датычыцца розных хітрасцяў, то з імі я асабліва не сустракалася. Адзіная «брудная» сітуацыя, якая можа здарыцца ў баі, — гэта, калі ад суддзі гучыць каманда «стоп» і біць пасля яе нельга, а саперніца мэтанакіравана ў гэты момант можа нанесці ўдар. Яшчэ здараюцца непрыемныя моманты пры рабоце ў клінчы, калі спартсменка спецыяльна падае на цябе зверху і цісне каленам на грудзі, каб збіць дыханне. Такое ёсць, але я стараюся не рабіць нічога падобнага, баксіраваць чыста, каб не было лішніх размоў.

**«Па жыцці я прывыкла заўсёды ісці наперад, імкнуся дамагацца свайго і разлічваю толькі на сябе»**

***— Ці можна сказаць, што бокс — гэта не жаночы від спорту?***

— Чаму? Не, гэта і жаночы від спорту ў тым ліку.

***— Ніколі не баяліся атрымаць траўму, якая адаб'ецца на знешнасці?***

— Не, не баялася. У мяне былі траўмы, напрыклад, летась пацярпела правае вока, але ўсё нармальна, дзякуй Богу, загаілася. Думак пра тое, каб кінуць бокс з-за гэтага наогул не было. Усё здараецца, гэта ж спорт, ніхто не застрахаваны. Раз я ўжо выбрала такі від, то павінна быць гатовая да ўсяго. Страху болю таксама ўжо няма. Першапачаткова, вядома, ён быў, раней, калі выходзіла і бачыла перад сабой саперніцу, не ведала, што з ёй рабіць. Здавалася, што яна забойца, хоць баксіруе, можа, значна горш за цябе. Усё з вопытам прыходзіць, з усведамленнем таго, што ёсць пэўная мэта — перамога, і ты да яе ідзеш.

***— Як родныя ставяцца да вашага ладу жыцця?***

— Баі яны практычна не глядзяць, а калі і глядзяць, то, думаю, не да канца разумеюць, што там і як адбываецца. У сям'і няма такога, каб за мяне трэсліся, празмерна засцерагалі. Я расла, можна сказаць, сама па сабе, а бацькі заўсёды падтрымлівалі мяне і ніколі не былі супраць бокса. Прыеду дадому з сіняком, яны з мяне пасмяюцца і ўсё.

***— Што маленькую дзяўчынку Алену прывяло ў секцыю па боксе?***

— Я заўсёды больш сябравала з хлопчыкамі, а яны хадзілі займацца тайскім боксам. Думаю, пайду і я. Вынікі прыйшлі адразу, я пачала выйграваць першыя месцы на чэмпіянатах рэспублікі, калі была юніёркай, не прайграла ні адных спаборніцтваў. Хоць наогул у дзяцінстве хацела стаць дызайнерам, у мяне да гэтага часу засталіся такія замашкі. Цікава, што з чым спалучаць у інтэр'еры. Калі прыязджаю да бацькоў у Асіповічы, пачынаю камандаваць куды, што трэба паставіць.

***— Ці даводзілася прымяняць свае баксёрскія ўменні ў штодзённым жыцці?***

— Хіба што ў дзяцінстве быў хлопчык, які чакаў мяне каля школы пасля ўрокаў і пастаянна біў. Усё скончылася, калі я вырашыла адказаць і сама ўдарыла яго. Ён усё зразумеў. З таго часу мы вельмі добра сябруем.

***— Алена ў баі і ў штодзённым жыцці — гэта розныя людзі?***

— Прыкладна аднолькавыя, па жыцці я прывыкла заўсёды ісці наперад, імкнуся дамагацца свайго і разлічваю толькі на сябе. Так у мяне і на рынгу атрымліваецца, я адразу займаю пазіцыю першага нумара.

***— Як думаеце, сябрам цяжка з вамі мець зносіны?***

— Калі казаць пра рысы характару, то спартыўны нораў, вядома, пастаянна праяўляецца. Я бываю запальчывая, і гэта ідзе ад спорту. Сяброўкам са мной лёгка, таму што я заўсёды гатова выслухаць, падтрымаць, парадавацца за кагосьці, а вось майму маладому чалавеку, думаю, складаней. У мяне ярка выяўленыя лідарскія якасці, мне трэба ісці толькі наперад, не магу сядзець на месцы, трэба ўсё рабіць хутка, выразна, каб усё было на сваіх месцах. У яго трошкі іншы характар, больш спакойны, я яму вельмі ўдзячная за тое, што ён умее знаходзіць кампрамісы.

***— З боку вы больш падобная на мадэль, чым на баксёрку.***

— У беларускім боксе шмат сімпатычных дзяўчат. У мяне гэтая жаноцкасць ідзе, напэўна, знутры, нічога спецыяльна я не раблю. Як і ўсе дзяўчаты, недзе нафарбаваць пазногці, прасачыць за валасамі.

Што датычыцца фігуры, то я выступаю ў вазе да 45 кг, таму заўсёды сачу за целам. Звычайна мой дзённы рацыён складаецца з абястлушчанага тварагу, ёгурту, яблыка або чарнасліву, у абед магу з'есці зусім трохі супу-пюрэ альбо яечню з агароднінай. У прынцыпе гэта пастаянна адно і тое ж, ем я вельмі мала. Бывае, што вельмі хочацца наесціся і я зрываюся, іду ў Макдональдс і бяру ўсё, што захачу, а потым зноў трымаю вагу. Шчыра скажу, гэта даецца мне не так проста, тым больш я проста жудасна люблю салодкае. Пасля буйных спаборніцтваў звычайна некалькі тыдняў ем адны прысмакі.

***— Чым займаецеся на выхадных?***

— Звычайна езджу да бацькоў у Асіповічы, дапамагаю ім, палю агарод, градкі, мне вельмі падабаецца гэтым займацца. У мяне там свае кветачкі, ружы растуць. А калі застаюся ў Мінску, то катаюся на веласіпедзе, езджу на рэчку, люблю гуляць у бадмінтон.

***— Што цяпер у планах?***

— Хацелася б яшчэ раз выйграць чэмпіянат свету, каб ужо пацвердзіць сваё званне. Тым больш у наступным годзе плануецца правесці яго ў Мінску. А ў простым жыцці, вядома, планую выйсці замуж і стварыць сям'ю. Мець дваіх-траіх дзетак і займацца любімай справай.

## ■ Экспрэс-навіны

### ПЕРАМОГА Ў КАНТЫНЕНТАЛЬНЫМ ПЕРШЫНСТВЕ

Зборная па мастацкай гімнастыцы стала пераможцам чэмпіянату Еўропы

**Каманда ў складзе Ксеніі Чалдышкінай, Ганны Дудзянковай, Марыі Кадобінай, Марыі Кацяк, Валерыі Пішчэлінай і Арыны Цыцылінай выйгралі залаты медаль кантынентальнага форуму ў ізраільскім Халоне ў асобных групавых практыкаваннях з пяццю стужкамі. Беларускі атрымалі ад суддзяў за сваю кампазіцыю — 18,516 бала. Другое месца ў гэтай дысцыпліне занялі гімнасткі Ізраіля — 18,400. Бронзавыя медалі ў скарбонцы зборнай Іспаніі — 18,133 бала.**

У турніры юніёраў беларускі па выніках выступленняў у асобных відах тройчы ўздымаліся на п'едэстал гонару. Сярэбраныя ўзнагароды выйгралі Юлія Ёчык у практыкаванні са скакалкай, Аліна Гарноська, якая выканала кампазіцыю з абручом. Трэцяе месца ў практыкаванні з булавамі ў Юліі Ісачанкі.

Усяго ж на рахунку зборнай Беларусі па мастацкай гімнастыцы 6 узнагарод. Раней каманда ў групавых практыкаваннях стала сярэбраным прызёрам у мнагабор'і.

Без узнагароды 32-га еўрафоруму засталася лідар зборнай Меліціна Станюта, якая завяршыла барацьбу ў індывідуальным мнагабор'і на чацвёртым месцы.

### ІХ ЧАКАЕ РЫА-ДЭ-ЖАНЭЙРА

Баскетбалісткі зборнай Беларусі дабіліся права выступіць на Алімпійскіх гульнях – 2016

**У нядзелю ў вырашальным паядынку за апошнюю пуцёўку ў Рыа супраць зборнай Паўднёвай Карэі падапечныя Анатоля Буяльскага выдатна правялі стартавы адрэзак, пайшоўшы ў адрыў з лікам 12:0.**

Пасля гэтага карэянкі здолелі наладзіць гульню, але першая чвэрць завяршылася з вынікам 12:8 на карысць беларусак. У другой дзесяцімінутцы беларускія баскетбалісткі зноў узялі ініцыятыву ў свае рукі, дабіўшыся перавагі ў 11 балаў — 27:16. У другой палове сустрэчы на пляцоўцы ішла зацятая барацьба, у выніку якой перамогу святкавалі беларускі — 56:39. Самай выніковай у складзе пераможцаў стала Ліндсэй Хардзінг, якая набрала 17 ачкоў.

Нагадаем, што ў кваліфікацыйным алімпійскім турніры ў Нанце наша зборная на папярэднім этапе заняла першае месца ў сваёй групе, абыграўшы каманду Нігерыі (71:60), і саступіла карэянкам (65:66), затым у чвэрцьфінале саступіла кітайскім баскетбалісткам (70:84), а потым у паўфінале "суцяшальнага" этапу разграміла аргенцінак (84:44).

У алімпійскім турніры ў Рыа-дэ-Жанэйра выступяць 12 дружын: Бразілія, ЗША, Сербія, Канада, Аўстралія, Сенегал, Японія, Францыя, Кітай, Іспанія, Турцыя і Беларусь. На першым этапе каманды будуць разбітыя на дзве шасцёркі, а потым па 4 лепшыя зборныя працягнуць барацьбу за ўзнагароды па сістэме плэй-оф. Жаночы баскетбольны турнір Алімпіяды-2016 стартуе 6 жніўня, а фінішуе 20-га.

Зборная Беларусі другі раз будзе гуляць на Алімпійскіх гульнях. У 2008 годзе ў Пекіне каманда Анатоля Буяльскага заняла 6-е месца.

**Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

# ТАЯМНІЧЫ ВОСТРАЎ

## ЯК НЕВЯЛІЧКАЯ ІСЛАНДЫЯ СТАЛА АДНОЙ З НАЙБАГАЦЕЙШЫХ КРАІН СВЕТУ

**Ісландыя апошнім часам зноў на слыху. Перш за ўсё дзякуючы ўдаламу выступленню нацыянальнай зборнай гэтай краіны на чэмпіянаце Еўропы па футболе. Ісландцы годна, у стылі нашчадкаў вікінгаў, асадзілі зорных імпульсіўных партугальцаў. Гэтая нічыя стала насамрэч адной з сенсацый Еўра-2016. І для кагосьці сапраўдным «адкрыццём Ісландыі» — невялічкай (колькасць жыхароў астраўной дзяржавы складае каля 330 тысяч чалавек — параўнальна з насельніцтвам нашага Брэста), аднак вельмі каларытнай краіны. Яе сёлета, між іншым, як чакаецца, наведаюць каля 1,6 мільёна замежных турыстаў. Чым жа так адметная гэтая паўночная краіна?**

### Марскі, вільготны, пераменлівы

Літаральны пераклад сцвярджае, што Ісландыя — «краіна льдоў». Хоць насамрэч гэта не зусім так. Спецыялісты кампетэнтна заяўляюць: клімат тут марскі, вільготны і пераменлівы. Надвор'е рэзка змяняецца нават цягам сутак, што залежыць ад праходжання цыклонаў ва ўсходнім напрамку праз Атлантычны акіян. Ісландская прымаўка сцвярджае: «Калі вам не падабаецца надвор'е, пачакайце пяць хвілін і стане яшчэ горш».

Увогуле на клімат Ісландыі ўплываюць два акіянскія цячэнні: цёплае — працяг Гальфстрыма — Паўночна-Атлантычнае і халоднае — Усходне-Грэнландскае, а таксама дрэйфуючы паўночны лёд, які збіраецца на паўночным і ўсходнім узбярэжжы. У самыя цёплыя месяцы (ліпень, жнівень) тэмпература паветра складае каля +20 градусаў, у студзені — каля -1 градуса.

Засяленне Ісландыі адбылося ў IX стагоддзі ў выніку аб'яднання Нарвегіі пад уладай караля Харальда I. Многія сем'і, якія ўступілі ў канфлікт з Харальдам, былі вымушаны збегчы ў пошуках новага месца для жыцця. Па меры засялення ў Ісландыі сфарміравалася дзяржаўная сістэма. У кожнай вобласці быў цінг (сход, аналаг веча), на якім вяршыўся суд і вырашаліся спрэчкі. Для вырашэння найбольш важных пытанняў прадстаўнікі абласцей збіраліся ў пачатку лета на альтынг пад кіраўніцтвам асаблівай асобы — законагаварыцеля.

Упершыню альтынг быў скліканы ў 930 годзе, і менавіта з гэтай даты адлічваецца эпоха народаўладдзя. У 1262-м Ісландыя была вымушана падпісаць так званы «Стары дагавор» з Нарвегіяй, па якім яна прызнавала вярхоўную ўладу нарвежскіх каралёў, а тыя, у сваю чаргу, абавязваліся накіроўваць ісландцам штогод па некалькі караблёў з лесам, збожжам і іншымі таварамі.

Дынастычная міграцыя ўлады ў скандынаўскіх краінах адпаведна змяняла і падпарадкаванне Ісландыі. 23 лютага 1551 года ў Ісландыі ўспыхнула паўстанне супраць дацкага панавання. Штуршком да яго паслужыла пакаранне апошняга ісландскага каталіцкага біскупа Ёна Арансана і яго сыноў. Паўстаўшыя ісландцы перабілі ўсіх датчан, якія знаходзіліся на востраве. Аднак карнай экспедыцыі дацкага караля Крысціяна III няцяжка было навесці «парадак» у маленькай краіне...

У 1567 годзе ў ісландскіх сялян аднялі зброю, і ім давялося надоўга змірыцца з чужаземным панаваннем. Пасля скасавання дацка-нарвежскай уніі ў 1814-м астраўныя ўладанні Нарвегіі, уключаючы Ісландыю, пакінулі ў складзе Даніі. У 1845-м быў адноўлены парламент, які захаваў старажытнаісландскую назву «альтынг».

1 снежня 1918 года Ісландыя была абвешчаная незалежным каралеўствам, праўда, у асабістай уніі з Даніяй. У маі 1940 года Вялікабрытанія захоплівае «краіну льдоў» і ў 1941-м перадае права акупацыі вострава ЗША. З 17 чэрвеня 1944 года Ісландыя здабывае поўную незалежнасць, становіцца рэспублікай. Гэты дзень адзначаецца тут як дзяржаўнае свята.

### На мяжы банкруцтва

Ісландыя мае вельмі мала прыродных рэсурсаў. Тут няма нафты, газу, вугалю і нават лесу, а сельскагаспадарчы патэнцыял краіны, 11 працэнтаў тэрыторыі якой займаюць ледавікі, вельмі абмежаваны. Рыба і прадукты з яе — галоўная галіна экспарту Ісландыі (у перыяд з 1881 па 1976 год — каля 90 працэнтаў ад агульнага аб'ёму пастаўвак за мяжу). Па сутнасці, пытанне захавання рыбных запасаў — гэта пытанне выжывання краіны.

Пасля атрымання незалежнасці эканоміка Ісландыі значна ўмацавалася, павысіўся жыццёвы ўзровень насельніцтва. У гэтых адносінах яна апярэдзіла іншыя скандынаўскія краіны і ўвайшла ў лік самых багатых краін свету. Эканамічны рост у 1996—2001 гадах складаў 3-5 працэнтаў у год. Ужо ў 2002-м больш за 220 тысяч ісландцаў карысталіся інтэрнэтам. Дарэчы, у 2007-м ААН прызнала Ісландыю лепшай краінай для жыцця ў свеце.

Праўда, былі тут і свае «шкілеты ў шафе». Да 2008 года ісландская эканоміка ўяўляла сабой велізарную фінансавую «бурбалку», у якой доля банкаўскага сектара ў 10 разоў перавышала ВУП. У астраўныя банкі пад высокія працэнты сцякаліся грошы з усяго свету. Краіна жыла ў крэдыт, па сутнасці ператварыўшыся ў велізарны хедж-фонд і не зазіраючы ў будучыню. Простыя ісландцы, атрымліваючы свой кавалак фінансавага пірага, заплюшчвалі вочы на велізарны ўзровень карупцыі і на дзівацтвы новых гаспадароў жыцця — банкіраў-нуварышоў, разбагацелых на фінансавых спекуляцыях, якія скуплялі самалёты і яхты і кідаліся грашыма направа і налева.

І вось «бурбалка» лопнула. Тры найбуйнейшыя ісландскія банкі абанкруціліся і былі нацыяналізаваны. Адны банкіры беглі за мяжу, іншыя атрымалі турэмныя тэрміны. Курс ісландскай кроны ўпаў на 60 працэнтаў, вельмі моцна згарнуўся і фондавы рынак. У банкаўскай сістэме краіны пачаліся сур'ёзныя праблемы. Ісландыя фактычна апынулася на мяжы банкруцтва. За 2009 год рэальны паказчык ВУП краіны скараціўся на 6,8 працэнта, што было абумоўлена падзеннем практычна напалову агульнай колькасці інвестыцый у такія сектары эканомікі, як будаўніцтва і сфера паслуг. Крызіс сур'ёзна паўплываў і на сітуацыю на рынку працы — узровень беспрацоўя дасягнуў рэкордных 9,4 працэнта.

З тыпова ісландскім аптымізмам жыхары вострава ўгледзелі ў фінансавым крызісе новыя магчымасці. «Зараз можна пачаць з чыстага ліста. Хто ведае, можа быць, гэта наш шанц пабудаваць яшчэ больш справядлівае і адкрытае грамадства, у якім улада будзе размеркавана больш раўнамерна, а ранейшыя шкурныя інтарэсы і эканамічныя блокі сыдуць у мінулае», — пісаў адзін з тутэйшых журналістаў.

**Ісландыя мае вельмі мала прыродных рэсурсаў. Тут няма нафты, газу, вугалю і нават лесу, а сельскагаспадарчы патэнцыял краіны, 11 працэнтаў тэрыторыі якой займаюць ледавікі, вельмі абмежаваны. Рыба і прадукты з яе — галоўная галіна экспарту**

І выйсце з багны было знойдзена. Раней Ісландыя была практычна краінай монакультурнай гаспадаркі — асноўнай крыніцай даходаў былі рыбалоўства і апрацоўка рыбы (32 працэнты агульнага аб'ёму прамысловасці ў 2001-м). Аднак у апошнія гады адбываецца інтэнсіўная дывэрсіфікацыя прамысловасці на аснове танных аднаўляльнай энергіі (у асноўным — геатэрмальныя крыніцы і гідраэнергетыка).

Урад Ісландыі абвясціў аб маштабнай праграме па будаўніцтве алюмініевых заводаў. Таксама актыўна развіваюцца біятэхналогіі, турызм, банкаўскі бізнес, інфармацыйныя тэхналогіі. Па структуры занятасці Ісландыя выглядае як прамыслова развітая краіна: у сельскай гаспадарцы занята 7,8 працэнта, у прамысловасці — 22,6; а ў сферы паслуг — 69,6 працэнта працаздольнага насельніцтва.

### На радзіму «Гульні прастолаў»

Цікавы расклад атрымаўся і з уступленнем Ісландыі ў Еўрасаюз. Справа ў тым, што краіна адклікала сваю заяўку ў сакавіку 2015 года. Не апошнюю ролю ў гэтым адыграла пытанне пра будучыню рыбалоўства, па-ранейшаму стратэгічнай галіны эканомікі Ісландыі. Уступленне ў Еўрасаюз азначала б для Рэйк'явіка далучэнне да сістэмы квот на вылаў рыбы. Аднак, будучы членам Еўрапейскай эканамічнай прасторы (мадэль эканамічнай інтэграцыі Еўрапейскага саюза і Еўрапейскай асацыяцыі свабоднага гандлю), Ісландыя і без сяброўства ў ЕС можа бяспошлінна экспартаваць сваю рыбную прадукцыю ў Еўрасаюз, ні з кім не дзелячыся рыбнымі багаццямі. Пры ўзроўні валавога ўнутранага прадукту на душу насельніцтва 46,6 тысячы долараў і тэмпах росту эканомікі ў 2015 годзе больш за 4 працэнты ісландцы не збіраюцца дзяліць рызыкі, якія стварае палітыка Бруселя. Настроі жыхароў Ісландыі падсумаваў міністр замежных спраў Гунар Свенсан: «Інтарэсам дзяржавы больш адпавядае знаходжанне па-за Еўрасаюзам».

Перспектыўны кірунак — развіццё турызму. Дзівосная прырода краіны з яе ледавікамі, фіёрдамі, гарачымі крыніцамі, белымі начамі, непаўторнымі маршрутамі штогод прыцягваюць у Ісландыю больш за 1 млн турыстаў з усяго свету. Летась прыехала больш за 1,2 млн чалавек, а ў бягучым годзе чакаецца 29-працэнтны рост колькасці наведвальнікаў — прыблізна 1,6 млн турыстаў паспрабуюць убачыць усе тыя прыгажосці, якімі славіцца Ісландыя. Гэта прыкладна 30 тыс. чалавек у дзень. Дарэчы, Ісландыя ўвайшла ў дзясятку самых турыстычных краін свету — тут больш за ўсё падарожнікаў у разліку на душу насельніцтва. Цікава, што істотную долю турыстаў складаюць прыхільнікі тэлесерыяла «Гульня прастолаў», якія імкнуцца наведаць месца здымак фэнтэзі.

Улады знайшлі спосаб абараніць унікальную прыроду і традыцыйную культуру краіны, бо тыя надзвычай пакутуюць ад турыстаў, якія штогод наведваюць гэтую краіну. Так, будуць уведзены абмежаванні для ўладальнікаў жылля, якія здаюць яго праз сэрвіс Airbnb. Менавіта ім карыстаецца большасць гасцей самай міралюбівай краіны, бо гатэляў не хапае на ўсіх. За апошні год колькасць пакояў і кватэр, якія здаюцца адпачывальнікам праз Airbnb, павялічылася ў Ісландыі на 124%. Прычым рынак кароткатэрміновай арэнды пашырыўся настолькі, што працярпеў сектар доўгатэрміновай арэнды: уладальнікі жылля аддаюць перавагу рабоце з турыстамі, а не з пастаяннымі наймальнікамі. У найбліжэйшай будучыні такім уласнікам нерухомасці прыйдзецца плаціць падатак на прыбытак як прадпрымальнікам. «Мы не хочам, каб у цэнтры Рэйк'явіка былі адны турысты і ні аднаго мясцовага жыхара», — заявіла дырэктар нацыянальнага турыстычнага офіса Visit Reykjavik Аусільдр Брагадоцір.

І яшчэ. Перад пачаткам Еўра-2016 вызначылі прыгажуню турніру. Пераможцай прызналі 21-гадовую ісландку Арнан Ёнсдоцір, якая атрымала акрамя кароны прэмію ў 3000 еўра. Другое месца заняла немка Лена Брудзер, трэцяе — партугалка Ганна Клаўдыя Бомфін. Так што Ісландыя на Еўра-2016 ужо ўсіх перамагла. І гэта самая прыгожая перамога. Ці не так?

**Захар БУРАК.** *burak@zviazda.by*

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении 22 июля 2016 года открытого аукциона по продаже недвижимого имущества

**Продавец и его юридический адрес:** Открытое акционерное общество «Строительно-монтажный трест № 40» , Гомельская область, г. Жлобин, ул. Барташова, 1, тел. (02334) 2 05 50

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Дата, время и место проведения аукциона, организатор торгов | Аукцион состоится **22 июля в 11-00**, по адресу: Гомельская область, г. Жлобин, ул. Петровского, 45 Коммунальное унитарное предприятие по операциям с недвижимым имуществом «Жлобинский центр управления районной коммунальной собственностью» | | |
| 2 | Срок приема документов | **с 9-00 до 13-00 и с 14-00 до 17-00 по рабочим дням по 20 июля 2016 года** | | |
| 3 | Номер лота | 1 | 2 | 3 |
| 4 | Наименование объекта (лота), адрес | двухэтажное кирпичное административное здание с кирпичной отапливаемой пристройкой, двумя тамбурами, мощением, забором с инвентарным номером 320/С-13500, расположенное по адресу: Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Шоссейная, д. 145 | комплекс зданий, в том числе: - одноэтажное сборно-щитовое, облицованное кирпичом, административное здание с кирпичной отапливаемой пристройкой, тамбуром, уборной с инв. № 320/С-14089; - одноэтажное кирпично-блочное здание гаража с надстроенным бытовым помещением с инв. .№ 320/С-22472; - одноэтажное металлическое здание склада с эстакадой с инв. № 320/С-22473; -одноэтажное из газосиликатных блоков здание склада для хранения строительных материалов с инв. 320/С-24072; - одноэтажное здание склада из газосиликатных блоков с двумя пристроенными гаражами из газосиликатных блоков с инв. № 320/С-22474, расположенных по адресу: Гомельская область, г. Жлобин, Жлобинский район, ул. Шоссейная, д.145 | одноэтажное кирпично-панельное здание склада с двумя кирпичными пристроенными гаражами и кирпичным пристроенным бытовым помещением и асфальтобетонной площадкой с инв. № 320/С-22471, расположенное по адресу: Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Шоссейная, д. 145 |
| 5 | Краткая характеристика объекта | Назначение: здание административно-хозяйственное, площадью 629,9 кв.м | Назначения: - здание административно-хозяйственное (инв. № 320/С-14089), площадью 140,8 кв.м; - здание специализированное автомобильного транспорта (инв. № 320/С-22472), площадью 97,1 кв.м; - здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (инв. № 320/С-22473), площадью 78,2 кв.м; - здание специализированное складов, хранилищ (инв. № 320/С-24072), площадью 99,6 кв.м; -здание специализированное складов, торговых баз, баз материально- технического снабжения, хранилищ (инв. № 320/С-22474), площадью 386,2 кв.м | Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, площадью 1759,2 кв.м |
| 6 | Площадь занимаемого земельного участка, га | участок № 1-0,2443 | участок № 2-0,3248 | участок № 3 — 0,8750 |
| 7 | Начальная цена объекта (лота) (с НДС) со снижением на 20 процентов, рублей | 2 553 600 000 (с 01.07.2016 г. 255 360 руб.) | 1 536 000 000 (с 01.07.2016 г. 153 600 руб.) | 3 763 200 000 (с 01.07.2016 г. 376 320 руб.) |
| 8 | Задаток для участия в аукционе | 200 000 000 (с 01.07.2016г. 20 000 руб.) | 150 000 000 (с 01.07.2016г. 15 000 руб.) | 300 000 000 (с 01.07.2016 г. 30 000 руб.) |
| | | Имеется обременение в регистрационных действиях | Имеется обременение в регистрационных действиях | Имеется обременение в регистрационных действиях, находится в ипотеке |
| Шаг аукциона 5% | | | | |

Аукцион состоится **22 июля 2016 г. в 11-00** по адресу: г. Жлобин, Петровского, 45, 2-й подъезд.

Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным организатором аукциона.

Организатор торгов – Коммунальное унитарное предприятие по операциям с недвижимым имуществом «Жлобинский центр управления районной коммунальной собственностью», 247210, Гомельская область, г. Жлобин, Петровского, 45, 2-й подъезд

Возможность ознакомиться с объектом предоставляется продавцом в срок **по 20 июля 2016 года** включительно.

Желающим участвовать в аукционе необходимо **по 20 июля 2016 года с 9-00 до 13-00 и с 14-00 до 17-00 по рабочим дням** представить в адрес организатора аукциона следующие документы:

- заявление на участие в аукционе;
- документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка;
- юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;
- иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно- финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;
- иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;
- представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) представляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Консолидированными участниками для участия в аукционе к соответствующему заявлению прилагаются следующие документы

–копия договора о совместном участии в аукционе с предъявлением оригинала этого договора;

- документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка;
- копии документов, подтверждающих государственную регистрацию индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций, заключивших договор о совместном участии в аукционе;
- сведения о средней численности работников микроорганизаций, заверенные подписью руководителя и печатью.

При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляют документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями и (или) микроорганизациями, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательном порядке, либо документ, подтверждающий полномочия руководителя.

Задаток перечисляется на р/с КУП «Жлобинский центр управления районной коммунальной собственностью» №3012006530013 в филиале 312 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Жлобин, код МФО 151501673, УНН 490317354.

Аукцион состоится при наличии не менее двух участников. Не допускается продажа по начальной цене. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним претендентом, предмет аукциона продается этому претенденту при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

До проведения аукциона с участниками заключается соглашение, в котором предусмотрены права и обязательности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, в том числе и размер штрафа, уплачиваемого участником, выигравшим торги, но отказавшимся или уклонившимся от подписания протокола и (или) договора, оформляемого по результатам аукциона (конкурса), и (или) возмещения затрат на организацию и проведение аукциона; участниками, отказавшимися объявить свою цену за предмет аукциона в случае, когда такое объявление предусмотрено законодательством, в результате чего аукцион признан нерезультативным.

Победитель торгов обязан:

- в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона внести на расчетный счет КУП «Жлобинский центр управления районной коммунальной собственностью» вознаграждение по результатам аукциона в размере 4% от начальной цены проданного объекта и 5% от суммы превышения цены продажи объекта над начальной ценой, но не менее суммы фактических расходов;
- в течение 10 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона заключить договор купли-продажи объекта;
- по лотам №№ 1, 2 в течение 15 рабочих дней с момента подписания договора купли-продажи произвести оплату за объект либо рассрочка на три месяца, путем перечисления на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Гомельского областного исполнительного комитета;
- по лоту № 3 в течение 15 рабочих дней с момента подписания договора купли-продажи произвести оплату за объект либо рассрочка на три месяца, путем перечисления на погашение основного долга по кредиту ЦБУ №305 ОАО «Белинвестбанк» г. Жлобин.

**Телефоны организатора аукциона: (02334) 3 16 16, 3 14 08.**
**Телефоны продавца для справок: (02334) 2 05 50, моб. тел. 8 (029) 618 50 41.**

IdeaBank
Отличная идея!

# Сведения о результатах Рекламной игры «Отлично всегда, удачно сегодня»

**1. Сведения об организаторе**

Организатором Рекламной игры является Закрытое акционерное общество «Идея Банк» (далее – Организатор), зарегистрированное 24.04.2004 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 807000122. Лицензия на осуществление банковской деятельности №25 от 03.06.2013 г. выдана Национальным банком Республики Беларусь. Местонахождение Заинтересованного лица: 220034, г. Минск, ул. З. Бядули, 11. УНП 807000122.

**2. Сведения о Рекламной игре**

Рекламная игра носит название «Отлично всегда, удачно сегодня» (далее — Игра) и проводится с 18 апреля 2016 года по 21 июня 2016 года включительно (включая сроки выдачи призов и опубликования результатов проведения рекламной игры). Свидетельство о регистрации рекламной игры №2734 от 12.04.2016 г. выдано Министерством торговли Республики Беларусь.

Всего к участию в игре было допущено 5 236 участников, полностью соответствующих требованиям Правил Рекламной игры. Призовой фонд разыгран не полностью. Члены комиссии постановили: остаток призового фонда признать доходом ЗАО «Идея Банк».

**3. Победители рекламной игры**

В соответствии с Правилами Игры победителями стали 35 участников:

| Победитель | Фамилия, инициалы победителя | Выигрыш | | Дата выдачи |
|---|---|---|---|---|
| | | Денежные средства | Дополнительные денежные средства | |
| Победитель №1 | Трубкина В.Е. | 723 151 | - | 04.05.2016 |
| Победитель №2 | Руденко З.А. | 4 729 281 | 558 743 | 28.04.2016 |
| Победитель №3 | Гребень А.К. | 7 093 920 | 912 080 | 29.04.2016 |
